# Пляцоўка для ўзаемадзеяння братніх народаў

**З 24 па 26 лістапада ў Мінску на базе Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі адбываўся Беларуска-расійскі форум новых культурных ініцыятыў, арганізатарамі якога выступілі Міністэрствы культуры Беларусі і Расійскай Федэрацыі.**



**Падчас форума.**

Фота Антона РУДАКА

Пленарнае пасяджэнне форуму было прысвечанае культурным ініцыятывам як аснове развіцця творчых індустрый у Беларусі і Расіі. Генеральны дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Аксана Кніжнікава распавяла аб асноўных напрамках супрацоўніцтва між беларускімі і расійскімі бібліятэкамі, узаемадзеянні ў сферы міжнароднага дакументаабмену, фарміраванні агульных лічбавых калекцый, аднаўленні помнікаў кніжнай культуры. Намеснік генеральнага дырэктара Нацыянальнага мастацкага музея Сяргей Вечар распавёў аб перспектывах развіцця згаданай установы, якая неўзабаве адкрые новыя карпусы, дзе размесцяцца рэстаўрацыйныя майстэрні і новыя выставачныя прасторы.

Таксама ў рамках форуму адбыліся адкрыццё выставы Дзяржаўнага музейна-выставачнага цэнтра РОСФОТО (Санкт-Пецярбург) і шэраг круглых сталоў, прысвечаных патэнцыялу творчых прадуктаў, якія фарміруюць нацыянальныя каштоўнасці на аснове матэрыяльнай і нематэрыяльнай культурнай спадчыны народаў Беларусі і Расіі, павышэнню канкурэнтаздольнасці творчых прадуктаў і паслуг айчынных прадпрымальнікаў, а таксама культуры ў сучаснай інфармацыйнай прасторы. Форум завяршыўся ўрачыстым прыёмам, зладжаным Міністэрствам культуры Расійскай Федэрацыі.

К


**КУЛЬТУРА**

ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ, ДЛЯ ДАСУГУ (КУЛЬТУРА, МАСТАЦТВА) Выдаецца з кастрычніка 1991 года.

Заснавальнік — Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
**Галоўны рэдактар** — КРЫВАНОС Аляксандр Паўлавіч; **адказны сакратар** — Ксенія ПАДОЛЬЦАВА; **рэдактар аддзела:** Яўген РАГІН; **аглядальнікі рэдакцыі:** Зміцер ЮРКЕВІЧ, Надзея БУНЦЭВІЧ, Надзея КУДРЭЙКА, Антон РУДАК, Павел САЛАЎЁЎ, Ілья СВІРЫН, Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ; **спецыяльны карэспандэнт:** Пётр ВАСІЛЕЎСКІ, **мастацкі рэдактар** — Наталля ОВАД.
Сайт: **www.kimpress.by**. E-mail: **kultura@tut.by**. Адрас рэдакцыі: 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77, чацвёрты паверх. Тэлефоны: (017) 286 07 97, (017) 334 57 23.
Тэлефон-факс: (017) 334 57 41. Рэкламны аддзел: тэл. (017) 286 07 97, 334 57 41.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА".
**Першы намеснік дырэктара** — КРУШЫНСКАЯ Людміла Аляксееўна.
Прыёмная: (017) 334 57 41.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Чацвёрты паверх. Бухгалтэрыя: (017) 334 57 35.
**Аўтары допісаў паведамляюць прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар пашпарта, дату выдачы, кім і калі выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца працы, зваротны адрас.**
Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Меркаванні аўтара могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў.
*Матэрыял на правах рэкламы.